УДК 233

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АБРАДУ “КАЛЯДАВАННЕ”, ЭЛЕМЕНТА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ “ПАКРЫВАЛА”

***І.А. Шапялюк,*** *8 клас*
*Навуковы кіраўнік –* ***Н.С. Шапялюк,*** *настаўнік*
***ДУА “Дастоеўская сярэдняя школа імя Ф. М. Дастаеўскага” Іванаўскага раёна***

**Уводзіны.** Звесткі пра духоўную спадчыну Дастоеўскага мікрарэгіёна прадстаўлены ў мінімальным аб’ёме. На жаль, захавальнікаў духоўных скарбаў з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Праз некалькі гадоў іх можа не быць, а разам з імі знікае і багацейшая народная культура Заходняга Палесся.

**Змест.** Большасць беларускіх абрадаў старажытнага паходжання ўзніклі на агульнай усходнеславянскай глебе. Старажытная абраднасць ляжыць у аснове калядавання, масленіцы, шчадравання, абрадаў купальскай ночы і інш. Многія абрады звязаны з культам продкаў (дзяды, радаўніца), расліннасці.

Асаблівасць беларускіх абрадаў - перапляценне ў іх аграрна-бытавых, язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў. Царква імкнулася забараніць народныя абрады або прыстасаваць іх да патрэб рэлігійнага культу, асобным абрадам вяселля, радзін, пахавання, надаць ім рэлігійны змест. Абрады ў аснове сваёй захавалі народную спецыфіку і лакальны каларыт, яны суправаджаюцца песнямі, танцамі, замовамі, карагодамі, пераапрананнямі (каза, жораў, дзед і інш.). У іх прысутнічаюць элементы тэатральнага дзеяння. З імі звязана сялянска-абрадавая паэзія [1].

З цягам часу абрады страцілі першапачатковае значэнне, роля рэлігійных элементаў у іх паступова змяншалася, яны пераходзілі ў разрад гульняў, святочных забаў і захоўваліся пераважна ў вёсцы.

Даведаўшыся ад носьбітаў найбольш яскравыя і адметныя асаблівасці лакальных свят і абрадаў, былі вызначаны найбольш адзначаемыя на тэрыторыі Дастоеўскага мікрарэгіёна, а менавіта вясельнага абраду “Пакрывала”і абраду “Калядаванне”.

Сямейныя абрады вельмі старажытныя па сваім паходжанні, аднак да сённяшніх дзён яны не страцілі мэтавай накіраванасці і прызначэння ў народным жыцці, здолелі захаваць у сабе адну з цікавейшых старонак народнага побыту, нашай культурнай спадчыны. Сямейна-бытавыя абрады, якія захаваліся на Палессі, звязаны з асвячэннем у царкве свечак, вады, ежы, раслін, таму і маюць шырокае бытаванне ў сілу сваёй практычнасці

Вяселле - гэта своеасаблівае тэатралізаванае прадстаўленне, у якім ярка адлюстраваліся характар і светапогляд народа, яго мастацкія здольнасці і псіхалогія, гэта, як лічаць фалькларысты, народная "опера", дзе кожны з удзельнікаў выконвае ролю не спектакля, а жыцця [2].

Адным з цікавых момантаў вяселля з'яўляецца элемент вясельнага абраду "Пакрывала". Так у вёсцы Застружжа перад ад'ездам у хату жаніха маці апранае на плечы дачкі кавалак белай тканіны (пакрывала). Па прыездзе да маладога жанчыны спяваюць пасажную песню, сват абводзіць маладых тройчы вакол стала, садзіць іх за стол. Маладых блаславўляе ўвесь род.

Праз некаторы час маладую выводзяць з-за стала. На яе месца тройчы прыводзяць падстаўных нявест, на галаве ў якіх пакрывала. Малады павінен пазнаць сярод іх сваю жонку. Падстаўная маладая імкнецца накінуць пакрывала і на яго, а ён усяляк адварочваецца. Пры гэтым увесь род падказвае маладому, што яму рабіць з гэтай "маладой".

Нарэшце прыводзяць сапраўдную маладую і садзяць каля жаніха. Пасля гэтага барабаншчык падыходзіць да стала маладых і гаворыць: "Пэршым разом, божым росказом, чы е ў гэтыйі молодэйі батько, маты, сусіды блызкі, далёкі, чы вылять благослоўляты, покрывало зняты?" Затым ён барабаннай палачкай здымае з плеч маладой пакрывала і аддае свякроўцы. Тая павязвае нявестцы на галаву хусцінку. Жанчыны становяцца ў круг, бяруцца за пакрывала, танцуюць і спяваюць. Пасля жанчыны складаюць пакрывала і аддаюць свякрусе. Свякруха з пакрывалам падыходзіць да стала маладых, блаславўляе нявестку і закідае яго за абразы. Абрад "Пакрывала" сімвалізаў смерць маладой, бо яна памірала як дзяўчына і нараджалася як жанчына.

Сучаснае вяселле ўжо не мае такі глыбокі сэнс, хоць і ў наш час многія маладыя не адмаўляюцца ад традыцый продкаў і ладзяць вяселлі па народных звычаях. Вясельная абраднасць дае яскравае ўяўленне пра сямейны лад, характэрныя вераванні, маральныя, этычныя і эстэтычныя погляды народа.

Каляды ў народным календары беларусаў - перыяд зімовых святкаванняў з 7 студзеня па 19 студзеня. На гэты перыяд прыпадаюць тры вялікія хрысціянскія святы праваслаўнай царквы: 7 студзеня – дзень нараджэння Ісуса Хрыста, 14 студзеня - дзень памяці епіскапа Кесарыі Кападакійскага, свяціцеля Васіля Вялікага, 19 студзеня - хрышчэнне Ісуса Хрыста ў водах ракі Іардан [3].

У дзень перад кожнаю куццёю ішлі ў царкву, а перад поснаю - спавядаліся. З першай зоркай уся сям'я збіралася на святочную вячэру. Елі ўсе кожную страву з аднае міскі, каб сям'я жыла ў згодзе. На наступны дзень святкавалі Ражство, паводле праваслаўнага календара святкуецца 7 студзеня. Абавязкова наведвалі царкву. Наладжвалі святочныя застоллі, якія былі шматлюдныя, бо запрашалі ў госці сваякоў, суседзяў.

З хваляваннем чакавалі першага наведвальніка, бо, лічылі, што прыход мужчыны абяцаў даббрабыт і шанаванне ў новым годзе, прыход жанчыны – усялякія непрыемнасці.

К вечару першага дня Ражства пачыналі хадзіць калядоўшчыкі. Калядаванне ўяўляла абход двароў калядоўшчыкамі з віншаваннем гаспадароў, выкананнем калядных песень, адорваннем гаспадарамі ўдзельнікаў абраду. Распачыналі калядныя прадстаўленні абходы з зоркай ( у вёсцы называлася "со звіздою ходыты"). Гэта была рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі. Да каркаса са знешняга боку прымацоўвалі пруткі і злучалі іх папарна так, што атрымоўваліся промні (рогі звязды). Канструкцыю абклейвалі паперай і аздаблялі рознакаляровымі выцінанкамі.

Абрад "Калядаванне" ў Дастоеўскім мікрарэгіёне мае шырокую папулярнасць сярод моладзі, аднак, на жаль, зараз ён носіць камерцыйны характар. Рэпертуар калядоўшчыкаў звычайна складаюць творы і песні, якія маюць шырокае распаўсюджанне ў глабальнай сетцы Інтэрнэт, нават калі яны маюць старадаўняе паходжанне, калядоўшчыкі спрашчаюць іх выкананне і адаптуюць для больш сучаснага гучання, адмаўляючыся такім чынам ад традыцыйнага выканання. Адваротны бок праблемы ў "нечаканні" гаспадарамі калядоўшчыкаў. Яны не пускаюць калядоўшчыкаў у хату альбо загадзя плануюць мерапрыемствы ў хатах родзічаў, знаёмых альбо грамадскіх месцах адпачынку. Прычына крыецца ў тым, што гаспадары не разумеюць значнасці свята для іх саміх і гаспадаркі.

**Заключэнне.** Падчас работы над тэмай даследавання мы запісвалі абрады, параўноўвалі іх з апісанымі ў літаратуры і зрабілі вывад, што гэтыя абрады ў наш час спрасціліся, сэнс іх змяніўся. Лічу, што апісаны мною элемент вясельнага абраду "Пакрывала" можна выкарыстоўваць падчас

святкавання традыцыйнага беларускага вяселля, а абад “Калядаванне” быў прадстаўлены для ўдзелу ў міжрэгіянальным конкурсе “Таленты Палесся” ў г. Пінску ў сакавіку 2022 года. Абрад “Пакрывала” і выступленне на фестывалі “Каляднае цуда” размешчаны на канале YuoTube. [4] У будучым плануецца размяшчэнне відэаматэрыялаў з экспедыцый і практычнай дзейнасці гуртkоўцаў у сацыяльных сетках і TikTok.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Варфаламеева Т.Б. Сямейныя абрады і звычаі  - Мінск : Вышэйшая школа, 2017. – 719 с.

2. Ліс А. С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Сістэма жанраў. Эстэтычны аспект. Мінск, "Беларуская навука", 1998 -188 с.

3. Святы і абрады беларусаў. 2-е выданне/ В. Д. Ліцвінка. Мінск: Беларусь, 1998. – 190 с.

4. Второй фестиваль "Рождественское чудо" Режим доступа : https://www.youtube.com/watch?v=Hyvsd8RgsOQ – Дата доступа : 05.02.2022.